В. І. ВЯРБІЦКАЯ

# ЖЫЦЦЁ І ТВОРЧЫ ШЛЯХ ЯЎСТАХА ТЫШКЕВІЧА Ў НАРЫСЕ ВІНЦЭСЯ КАРАТЫНСКАГА / EUSTACHO TIŠKEVIČIAUS GYVENIMAS IR KŪRYBINGAS KELIAS Į VINCENTO KARATYNSKY DARBŲ

V. VIARBITSKAYA

# LIFE AND CAREER OF YAUSTAKH TYSHKEVICH IN THE SKETCH BY VINTHES KARATYNSKY

*Article is devoted to the analysis of a sketch of the Belarusian poet of the 19th eyelid V. Karatynsky «Yaustakhy Tyshkevich». Value of creativity of Y. Tyshkevich for development of original Belarusian culture reveals.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У еўрапейскім тышкевічазнаўстве, у тым ліку і беларускім, на наш погляд, найбольш даследавана навуковая і асветніцкая дзейнасць Канстанціна Тышкевіча. Магчыма, гэта тлумачыцца большымі накладамі папулярна выкладзеных яго прац. У першую чаргу цудоўнай кнігі «Wilija i jej brzegi» (1871), твораў «O kurhanach na Litwie i Rusi Zachodniej» (1868), «Wiadomosci historyczne o zamkach, horodyszczach i okopiskach starożytnych na Litwie i Rusi Lietewskiej» (1859). Але навуковая, культурна-асветніцкая руплівасць малодшага брата, Яўстаха, падаецца, мае не меншую значнасць. Гэта адзначалі А. Г. Кіркор, В. П. Грыцкевіч, Г. А. Каханоўскі і іншыя даследчыкі спадчыны братоў.

Яўстаху Тышкевічу прысвечаны нарыс беларускага паэта XIX ст. Вінцэся Каратынскага (1831–1891), пяру якога належаць многія артыкулы, звязаныя з гісторыяй і культурай Беларусі. Нарыс напісаны ў год смерці графа (Каратынскі, В. Яўстах Тышкевіч / В. Каратынскі // Творы : пер. з пол. / укл., прадм. і камент. У. Мархеля. – Мінск : Мастац. літ., 1981. – С. 126–141).

В. Каратынскі выбіўся «ў людзі з сялян». Адукацыю атрымаў саматугам, нават авалодаў нямецкай, польскай, рускай, французскай, чэшскай мовамі. Па парадзе тады ўжо вядомага пісьменніка У. Сыракомлі пачаў займацца паэзіяй. Літаратурную спадчыну В. Каратынскага складаюць тры паэтычныя кнігі: «Чым хата багата, тым рада» (1857), «Таміла» (1858), «Выпіў Куба да Якуба» (1859).

Нарыс пачынаецца з лірычных радкоў, з якіх паўстае маляўнічы вобраз аднаго з куткоў нашага краю – Лагойшчыны былога Барысаўскага павета. З замілаваннем паэт апісвае прыроду старажытнага наваколля мясціны, дзе нарадзіўся Яўстах: *«Густая сетка балот, якія шырока цягнуцца па берагах Дзвіны і Дняпра, мноства рэк і рачулак, што імкнуцца да гэтых галоўных артэрый, а за імі да Балтыйскага і Чорнага мораў, глыбокія і непраходныя лясы, што наяршыліся з аднаго боку ад Палесся, а з другога – ад Дзісеншчыны, спрадвеку былі і да гэтага часу застаюцца як бы натуральнымі сценамі з абодвух бакоў прасторы, на якой асела Барысаўшчына»* [с. 126]. Аўтар нарыса выказвае думку аб даўнім засяленні Лагойшчыны, якая была спрыяльнай для жыцця чалавека і якую імкнуліся захапіць суседнія плямёны, а пазней і народы. Аб гэтым сведчаць, паводле В. Каратынскага, густа раскіданыя замчышчы, курганы, акопы і магілы розных часоў. Такім чынам, прыходзіць да высновы паэт, прырода і гісторыя стварылі цудоўны матэрыял для даследчыкаў мінуўшчыны. Яўстах, піша Каратынскі, *«ужо ў ранняй маладосці, акружаны помнікамі розных вякоў і народаў, навучыўся ён сягаць думкай і сэрцам па ланах мінуўшчыны…»* [с. 128].

У нарысе паказаны сямейныя каштоўнасці графскай сям'і, дзе на першы план выступала разумовае выхаванне. Правілам добрага тону у родзе Тышкевічаў было даць першую адукацыю *«пад вокам бацькоў, ад настаўнікаў і настаўніц са старэйшых класаў мінскай гімназіі»* [с. 127]. Таму навучанне Яўстаха, на думку аўтара нарыса, было *«элеганцкім, вытанчаным, усяведным, але не глыбокім»* [с. 127]. Менавіта таму паглыбляў веды юнак два гады самастойна ў пецярбургскіх бібліятэках. Каратынскі лічыць, *«што юнак вяльможнага і заможнага дому, за рэдкім у гэтых сферах прыкладам, кінуўся да самастойнага папаўнення ведаў і, можна сказаць, уласнымі рукамі назапасіў вялікія скарбы гістарычнай навукі»* [с. 127]. Але ведаў, каб на дастаткова высокім узроўні займацца археалогіяй, Яўстаху не хапала, таму няўрымслівы граф вырашыў у 1843 г. паехаць за мяжу вучыцца. У Даніі, Фінляндыі, Швецыі ён спасцігае навуковыя метады сваіх калег. Вынікам «замежнай стажыроўкі» стаў двухтомнік «Listy o Szwecji». Каратынскі адзначае, што вартасцю дадзенага выдання былі не толькі *«маляўнічасць апавядання і гарачае аўтарскае пачуццё»* [с. 130], але і *«погляд на сучасны стан Швецыі, і звычаі яе народа, параўнаныя з літоўскімі, і расказы пра багацці дагістарычных*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*шведскіх помнікаў»* [с. 130]. Патрыёт сваёй Радзімы, ён імкнуўся даведацца, якія каштоўнасці шматлікіх войнаў вывезлі з ВКЛ шведскія заваёўнікі. З гэтай мэтай Я. Тышкевіч *«ганяўся за скарбамі радзімы па шведскіх гарах і лагчынах і склаў каштоўны каталог»* [с. 130]. З гэтай нагоды *«праца Тышкевіча паводле яе ўнутраных вартасцей, здаецца, займае першае месца»* [с. 130]. Яна, на погляд В. Каратынскага, адкрыла даследчыкам крыніцу невядомых рэчаў, якой нават праз некалькі дзесяцігоддзяў пасля яе выдання карысталіся як спецыялісты, так і гісторыкі.

Набытыя прафесійныя веды спрыялі карпатлівым пошукам Я. Тышкевіча артэфактаў культуры, з дапамогай якіх навуковец імкнуўся ўзнавіць гісторыю Барысаўшчыны. Даследаваць старажытную мінуўшчыну археолаг пачынае з ваколіц Лагойска, а потым пашырае раскопкі на ўсю поўнач. В. Каратынскі падкрэслівае: вяліся раскопкі *«з незвычайным веданнем справы, што можа даць толькі непасрэднае судакрананне з рэчамі»* [с. 128]. За аснову археалагічных даследаванняў Я. Тышкевіч узяў метад дацкага археолага К. Томсена, які падзяліў старажытнасць на тры эпохі-вякі: каменны, бронзавы і жалезны. Такі падыход да перыядызацыі старажытнай культуры Я. Тышкевіч выкарыстоўваў пры сістэматызацыі археалагічных знаходак у лагойскім музеі. Васьмігадовыя пошукі (1835–1842) і іх вынікі сталі асновай работы «Rzut oka na żródla archealogii krajowej, czyli opisanie niektórych zabytków starożytności odkrytych w zachodniach guberniach Cesarstwa Rosyjskiego» (1842). В. Каратынскі адзначае, што яна была *«першай сістэматызаванай працай пра мясцовую дагістарычную археалогію... і ахоплівала ўсе прадметы дагістарычнай старажытнасці: курганы, слёзніцы, жаночыя ўпрыгожанні, металічную зброю, каменныя малаткі, манеты, ідалы і іншыя прадметы, якія складаюць археалагічныя знаходкі, а таму для незнаёмых з археалогіяй і шматлікіх пад той час аматараў магла быць добрасумленным даведнікам»* [с. 129]. Адметнасцю выдання былі і шматлікія якасныя літаграфіі, выкананыя прафесіянальным мастаком Ю. Азямблоўскім.

Навукова-даследчая дзейнасць Я. Тышкевіча, заўважае аўтар нарыса, не спынялася, нават калі граф стаў маршалкам шляхты Барысаўскага павета. Пад яго навуковым кіраўніцтвам былі сабраны разнастайныя статыстычныя звесткі пра тагачаснае сацыяльна-эканамічнае жыццё Барысаўшчыны, якія паслужылі матэрыялам для яшчэ адной важнай працы – «Opisanie powiatu

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Borysowskiego…» (1847). В. Каратынскі вельмі высока ацэньвае фальклярыстычны раздзел кнігі: *«…збор народных песен і прымавак з'яўляецца вельмі каштоўным на той час, калі ні Чачот, які збіраў песні над Нёманам, ні іншыя, хто круціўся над Прыпяццю, Віліяй і Святою, не заглядвалі ў той бок, да Бярэзіны»* [с. 132]. Паэт асобна адзначае: Я. Тышкевіч быў адзіным маршалкам, які займаўся даследаваннем фальклору, і шкадуе, што іншыя кіраўнікі шляхты не падтрымалі пачын графа. Не засталіся ў баку і археалагічныя звесткі. Паводле В. Каратынскага, *«амаль тры чвэрці ўсёй кнігі займаюць апісанні курганоў, замчышчаў, гістарычныя ўспаміны, этнаграфічныя працы»* [с. 132].

Пасля трохгадовай службы ў Барысаве Я. Тышкевіч пераязджае ў Мінск і абіраецца на пасаду куратара гімназіі і члена камісіі па зборы і публікацыі даўніх актаў і прывілеяў, што захоўваліся ў архівах горада і манастырах. *«Аднак, – як піша В. Каратынскі, – ні службовыя абавязкі, ні корпанне ў архівах не маглі цалкам адарваць Тышкевіча ад улюбёных пошукаў з матыкай стражніка ў полі»* [с. 133]. У выніку з'яўляецца яшчэ адна надзвычай карысная ў навуковым плане праца – «Badania archeologiczne nad zabytkami przedmiotów sztuk i rzemiosł i t.d. w dawnej Litwie i Rusi Litewskiej» (1850). На думку В. Каратынскага, дадзеная праца *«цікавая з таго пункту гледжання, што нічога ў ёй няма пазычанага, а ўсё, што аўтар напісаў пра акопы, курганы і каменную зброю, было вынікам уласных яго адкрыццяў і вывадаў»* [с. 133].

У дадзенай працы вучоны дае таксама інтэрпрэтацыю поглядаў шэрагу вядомых заходнееўрапейскіх археолагаў і са шкадаваннем канстатуе, што славянская і літоўская археалогія не ўзняліся да такой ступені дасканаласці. Тут Я. Тышкевіч ускрывае прычыны такога занядбанага становішча айчыннай археалогіі. Важнейшай называе *«адсутнасць у нашым краі навуковых таварыстваў»* [с. 134]. Прыйшоўшы да такой высновы, ён ставіў сабе за мэту стварыць археалагічнае таварыства. На гэтым шляху Я. Тышкевічу сустракаліся амаль неадольныя цяжкасці. Акрамя таго, што трэба было назбіраць велізарную колькасць культурна-гістарычных артэфактаў, літаратуры для бібліятэкі, неабходна было пераканаць пецярбургскія і мясцовыя ўлады ў неабходнасці стварэння навуковага таварыства. Толькі ў 1853 г. удалося пераканаць тагачаснага віленскага генерал-губернатара Бібікава ў карысці таварыства і музея старажытнасцей. Два гады яшчэ даклад Бібікава разглядаўся ў Пецярбургу, і толькі вясной 1855 г. у сталіцы імперыі

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

зацвердзілі статут археалагічнай камісіі і музея старажытнасцей. Паводле статуту пажыццёвым старшынёй і куратарам прызначаўся Я. Тышкевіч.

Аўтар нарыса шмат увагі ўдзяляе апісанню экспазіцый музея, зазначае, што граф *«аддаў музею ўсе свае зборы, назапашаныя за дваццаць гадоў вялікай затратай часу і грошай, а часткова выкарыстаннем шырокіх сваяцкіх сувязей і знаёмстваў»* [с. 135]. Паэт паведамляе, што Райнгольд Тызенгаўз падараваў арнаталагічны кабінет, А. Г. Кіркор – цудоўны старадаўні збор і, дарэчы, падрыхтаваў каталог музея. Увесь сэнс жыцця графа ў гэты час сканцэнтраваўся на музеі і археалагічнай камісіі. Каратынскі піша, што за ўласны кошт Тышкевічам ажыццяўляліся выданні музея. Агульнымі намаганнямі, па меркаванні В. Каратынскага, быў створаны *«адзіны ў нас такога роду публічны збор старажытнасцей, з якім ні зборы познаньскага Таварыства сяброў навукі, ні кракаўскага Таварыства навуковага, ні тым болей львоўскага сховішча Асалінскіх не маглі ісці ў параўнанне»* [с. 136]. Перадае паэт і атмасферу барацьбы Я. Тышкевіча з генералам Сталыпіным, які пад выглядам рэарганізацыі імкнуўся спыніць існаванне музея. Напалоханыя паўстаннем 1863–1864 гг., расійскія ўлады ставілі сабе за мэту спыніць дзевяцігадовую культурна-асветніцкую дзейнасць музея, у якім яны бачылі дзейсны сродак фарміравання нацыянальнай самасвядомасці беларусаў. Уладам удалося вымусіць Я. Тышкевіча падаць у адстаўку, а зборы музея перадаць *«пад кіраўніцтва спецыяльнай камісіі, складзенай з настаўнікаў мясцовай гімназіі і школы рабінаў»* [с. 137]. Вучонаму было балюча назіраць, як знішчалі мару яго жыцця, таму ён пакідае ўласны дом на прадмесці Антаколь у Вільні і пасяляецца ў мястэчку Біржы ў маёнтку графа Міхала Тышкевіча. Дарэчы, В. Каратынскі звяртае ўвагу на тое, што дом у Вільні быў «асяродкам разумовага жыцця»: *«Дзякуючы цудоўнаму абыходжанню гаспадара людзі ў не надта свежай тужурцы і з непасрэднасцю, як ва ўласным доме, аціраліся аб людзей у выдатным парыжскім фраку, з выдатным імем ці становішчам, і ніхто гэтаму не здзіўляўся, і нікому ад гэтага не было нязручна»* [с. 141].

Жмудзінскі перыяд жыцця графа Я. Тышкевіча быў не менш плённым. Ён даследуе гістарычнае мінулае гэтага краю: раскопвае курганы, збірае народныя паданні, песні і прымаўкі, вывучае некранутыя старасвецкія архівы. У выніку нястомнай навукова-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

даследчай працы з’явіліся заснаваныя цалкам на архіўных крыніцах кнігі «Birze. Rzut oka na przesztosc miasta, zamku i ordynacji» (1869), «Żródła do dziejów Kurlandii i Semigalii…» (1870). Адначасова ён працаваў над гістарычнай працай «Groby rodziny Tyszkiewiczów» (1873), якую аздаблялі літаграфіі.

В. Каратынскі звяртае ўвагу яшчэ на адну малавядомую грань творчасці графа Я. Тышкевіча. Ён стварыў цыкл твораў прыгожага пісьменства, ім напісана шмат апавяданняў, аповесцей, нарысаў («Пан Харошча», «Другая жонка», «Вінцэнт Марэвіч», «Дзённікі панны ўтрыманкі» і інш.). У стылі апавядальных нарысаў Тышкевіч стварае партрэты-вобразы рэальных тыповых асоб, уваскрашае мастацкімі сродкамі гістарычныя ўспаміны і народныя паданні. Творы такога роду склалі змест двух зборнікаў пад назвай «Obrazy domowego pozycia na Litwie» (1865). Праўда, В. Каратынскі адзначае, што па мастацкай вартасці яны ўступаюць творам лепшых майстроў прыгожага пісьменства, але ў шэрагу твораў тагачасных пісьменнікаў былі адметныя трапнасцю малюнка гістарычнай старажытнасці, эпізодаў паўсядзённага жыцця, дакладнасцю перадачы рэальных характараў.

Падаецца, што да напісання нарыса «Яўстахій Тышкевіч» паэт Вінцэсь Каратынскі звярнуўся, каб праз вобраз патрыёта беларускай зямлі паказаць свету існаванне адметнай самабытнай культуры беларусаў, вартай стаўлення да сябе, якім яно было ў героя нарыса, а таксама даць узор для пераймання, – вобраз суайчынніка, жыццё якога было поўнасцю аддадзена клопату пра родны кут.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ